МАДЭЛЬ ПАСКОРАНАГА РАЗВІЦЦЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Усё гэта зразумела. А тыя, хто заклікае мяне прыязджаць сюды хоць бы адзін раз у год і тады тут навядуць парадак, памыляецца. Пасля майго прыезду вы самі будзеце наводзіць парадак і будзеце трымаць горад у такой чысціні, якую я ўбачыў сёння».

Чысціня і парадак — значныя характарыстыкі горада і для інвестараў. Асаблівы транспарты статус Баранавіч вызначае і яго геаграфічнае становішча — на скрыжаванні шляхоў магістралі з Кітая на захад Еўропы. І патэнцыял гэтага напрамку павялічваецца.

«Вы ведаеце, што будзе бурная рэакцыя на мае словы, я нават здзіўляюся, як быццам першы год працую Прэзідэнтам. Варта слова сказаць і адразу пайшла хваля, пачынаючы з Мінска на Усход, на Захад. Усе разглядаюць нас і так, і гэтак, і гэта натуральна, таму што Беларусь стала эпіцэнтрам нашага рэгіёна ў сілу таго, што мы з вамі, сціснуўшы зубы, вытрымалі ўсе нападкі, — акцэнтаваў увагу лідар краіны. — Але працаваць сёння трэба ў новых умовах. Увесь свет глядзіць на Беларусь, асабліва тыя краіны, якія знаходзяцца ў нашым рэгіёне».

Эканоміка — гэта галоўнае, толькі з моцным эканамічным сектарам краіна будзе стабільнай. «Многія з вас кажуць, што прыезд Прэзідэнта ў Баранавічы — гэта «Орша-2». Правільна. Можа не два, можа і не тры, не будзем лічбамі кідацца, але гэта тое, што пачата ў Оршы. Я ўжо папярэджваў, што з Оршы пачалі, таму што я там ведаю кожны квадратны метр. Ідучы на эксперымент, на нейкую бурную мадэрнізацыю, развіццё, трэба сябе адчуваць як рыба ў вадзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ідэі Прэзідэнта будуць апрацаваны ў Аршанскім рэгіёне, а потым пройдуць на іншыя дзесяць гарадоў. «Пракруціўшы на Оршы шэраг праектаў, мы рухаемся, як я абяцаў, у аналагічныя гарады. Сёння — Баранавічы. У Оршы вопыт складаны быў, там мы фактычна страцілі палову ўрада. Не хацелася б, каб гэта здарылася ў Брэсцкай вобласці», — заўважыў Прэзідэнт.

Работа будзе асабліва напружанай на працягу двух гадоў, падчас якіх адбудуцца прэзідэнцкія і парламенцкія выбары. Таму такія сустрэчы з актывам гарадоў стануць традыцыйнымі. Асаблівая ўвага будзе надавацца развіццю малых, сярэдніх гарадоў, і гэта звязана з неабходнасцю раўнамернага распаўсюджвання вытворчых сіл у краіне.

Для таго каб рабочая сіла не з'язджала ў іншыя месцы, трэба стварыць умовы для жыцця. «Перад намі стаіць задача перад усім развіваць эканоміку рэгіёнаў, каб былі рабочыя месцы і заробкі, і на гэтай аснове вырашаць сацыяльныя пытанні, скараціўшы да мінімуму разрыў у якасці жыцця насельніцтва», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Зялёныя тэхналогіі і беларускія кавуны

Прэзідэнт звярнуў увагу, што перад тым, як ствараць больш прадукцыі, трэба вырашыць, дзе яе рэалізоўваць. «Старэйшы брат» перад намі дзверы зачыняе, адны, другія. Еўрапейскі саюз нас не вельмі вітае, бо ў іх свайго дабра хапае, — сказаў Прэзідэнт. — Таму мы вымушаны ісці на далёкую дугу. Добра, што з Кітаем выдатныя адносіны».

Па словах кіраўніка дзяржавы, аграрыям неабходна прыстасоўвацца да клімату, які змяняецца. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што будучы ў Таджыкістане, папрасіў Эмамалі Рахмона прывезці ў Беларусь вінаград. Так у Гомелі, Брэсце з'явіліся вінаградныя ўгоддзі і — перспектыва імпартазамяшчэння.

«Мы павінны ствараць тое, што можа здзівіць людзей, а бульба і іншыя культуры могуць здзівіць, калі яны створаны па зялёнай тэхналогіі», — адзначыў беларускі лідар.

Пашыраць аб'ёмы вытворчасці трэба за кошт нетрадыцыйных для Беларусі культур. Прэзідэнт выказаў ідэю, што трэба ў сябе вырошчваць кавуны, якія дадуць добрае насенне.

Фермы, па словах Аляксандра Лукашэнкі, неабходна ператварыць у сучасныя комплексы. «Там вы атрымаеце добрае малако, прадасце і атрымаеце 35—40 % рэнтабельнасці. Некаторыя гаспадаркі і больш атрымліваюць, па 70 %. На нафце няма такой рэнтабельнасці сёння», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Баранавіцкі раён — адзін з найбуйнейшых у краіне. За мінулы год ён дабіўся станоўчых вынікаў: узрос аб'ём прамысловай вытворчасці, экспарту тавараў і паслуг, прамых замежных інвестыцый. Да таго ж нізкім застаецца ўзровень беспрацоўя.

«У гэтым годзе вы павінны мабілізаваць усе рэсурсы, каб дасягнуць новага ўзроўню развіцця эканомікі і сацыяльнай сферы. І ў вас усё для гэтага ёсць, у тым ліку і ў сельскай гаспадарцы, — адзначыў Прэзідэнт. — Неабходна значна павялічыць вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі, палепшыць фінансавыя паказчыкі прадпрыемстваў, і вельмі важна ствараць рабочыя месцы».

Ад дакладчыкаў Прэзідэнт хацеў пачуць, што неабходна зрабіць для ўстойлівага росту эканомікі горада, раёна і якія рэзервы бачыць актыў для павышэння сацыяльных стандартаў жыцця. Кіраўнік дзяржавы асабліва адзначыў, што чакае ад выступоўцаў дакладных адказаў, прадуманых, канкрэтных прапаноў для вырашэння праблем.

Рэнтабельная вытворчасць

Асабліва спыніўся Прэзідэнт на жыллёвай праблеме: «Якая цана квадратнага метра?»

«У цэлым кошт жылля — 850 рублёў, самы высокі больш за 1000, у элітных раёнах Брэста маналітнае жыллё каштуе 1000—1200»,— прагучаў адказ кіраўніка Брэсцкай вобласці Анатоля Ліса. Будуюць дамы прыватныя кампаніі за свой кошт.

«Рэнтабельнасць — гэта не толькі выдаткі. Рэнтабельнасць — гэта і цана. І 5 % рэнтабельнасці — гэта абмежаванне цаны квадратнага метра, якая вядзе да патаннення жылля насельніцтву. А калі ім прадаём па 1200, як вы, то трэба рабіць так, каб гэтыя грошы заставаліся ў вас»,— растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Правесці эксперымент з будаўніцтвам жылля з 5%-най рэнтабельнасцю Прэзідэнт даручыў і ў Брэсцкім рэгіёне.

«Мы сёння сабраліся гаварыць аб перспектывах, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.— Тут, у Баранавічах, куды ні кінь, адно прадпрыемства — птушкафабрыка «Дружба». Вы што, хочаце ўвесь раён на адну нітку падвязаць і трымаць яго ў гэтым стане? А калі заўтра птушка не пойдзе, што вы будзеце рабіць?» Таму, па словах Прэзідэнта, неабходна развіваць у рэгіёне не толькі дыверсіфікацыю экспарту, але і вытворчасці. Рэгіён не павінен замыкацца на адным відзе прадукцыі, а ствараць новыя, нават нетрадыцыйныя тавары і вырабы.

На вырашэнне праблем прамысловых прадпрыемстваў рэгіёна кіраўнік дзяржавы даў тры месяцы.

На нарадзе зноў вярнуліся да пытанняў чысціні ў горадзе. Прэзідэнт пацікавіўся, як справы з перапрацоўкай і асобным зборам смецця.

«Смецце — гэта рэнтабельная вытворчасць, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі б мы рупліва падыходзілі да гэтых рэсурсаў, мы б на 50 % былі багацейшыя».

Каментуючы скаргі жыхароў Баранавіч на дарогі, Прэзідэнт прапанаваў кіраўніцтву горада свой варыянт выйсця з сітуацыі: «На працягу двух гадоў яны павінны быць прыведзены ў нармальны стан. Бярыце шапкі, ідзіце з імі па Баранавічах і раёне. Гэта вобразна — з шапкамі. Стварыце фонд у райвыканкаме. Хто адкуль, патрошку, з прыватнікаў хтосьці грошы дасць — і прывядзіце ў парадак дарогі».

«Хмарачосы» толькі ў развіцці

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што як зарплаты, так і пенсіі ў першую чаргу залежаць ад эканамічнага развіцця і эфектыўнай работы прадпрыемстваў. Неабходныя ініцыятыва і намаганні на месцах. «Выпусціў тавар — прадаў — плаці зарплату. Ніхто не перашкаджае. Я ж у вас не адбіраю. Але калі нехта думае, што мы будзем плаціць заработную плату тым, хто сёння «несур'ёзна» працуе і зарабляе там 600—700 рублёў, як пішуць, а мы будзем даплачваць да 1100, то вы павінны разумець, за кошт каго. Мы што, павінны адабраць у кагосьці грошы, хто больш зарабляе, і аддаць тым, хто менш? Гэта няправільна!» — заявіў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што плануе вярнуцца ў Баранавічы ў другім паўгоддзі, каб убачыць дынаміку развіцця. Кожнае прадпрыемства раёна павінна займець свой план мадэрнізацыі і ўдасканалення вытворчасці. Па словах Прэзідэнта, у Баранавічах 30 % стратных прадпрыемстваў. Але да першага верасня будучага года заробкі ў рэгіёне павінны дасягнуць 1000 рублёў.

Ідэю вырашыць праблему жылля за кошт шматпавярховых дамоў кіраўнік дзяржавы ўспрыняў скептычна. «Не разганяйцеся на завоблачныя вышыні. Не трэба больш за 10—11 паверхаў дамы будаваць у Баранавічах, — лічыць Прэзідэнт. — Не вельмі прыемна людзям жыць там, за аблокамі. Не трэба гэтыя «хмарачосы» будаваць у Беларусі. У нас месца хапае. Будуйце камфортнае жыллё». Будаўніцтва трэба развіваць і ў пасёлках-спадарожніках.

Асабліва ўважліва Беларусь пачала ставіцца да замежных інвестараў. Вельмі каштоўныя ў іх тэхналогіі, якіх у нашай краіне няма. Але ні ў якім разе не павінны з'явіцца на рынку прадпрыемствы-канкурэнты айчынным вытворцам. «Нам патрэбныя інвестыцыі, якія будуць на карысць нашым людзям і нашай дзяржаве ў выглядзе дабаўленай вартасці, якая застанецца ў нас, каб быў прыбытак, былі падаткі, каб прадпрыемствы развівалася», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пасля нарады з Прэзідэнтам кіраўніцтва горада і раёна чакае вялікая работа. «Я вам расказаў, як мы будзем развівацца ад Мінска да неперспектыўных вёсак. Вы мяне пачулі, а цяпер давайце дзейнічаць. Пасля першага паўгоддзя пачнем канкрэтна пытацца. Мне даложаць па кожным прадпрыемстве камісійна. Я не хацеў бы страціць асноўную частку ўрада ў горадзе Баранавічы», — заключыў беларускі лідар.

Каля гарвыканкама Баранавіч, дзе праходзіла сустрэча з актывам, пасля нарады сабраліся жыхары. Пакінуўшы будынак, Прэзідэнт не абмінуў гараджан і адразу накіраваўся на размову. Грамадзяне цікавіліся найбольш актуальнымі і надзённымі пытаннямі — заробкамі, ростам цэн, пенсіямі, коштам паслуг.

Пасля нарады Прэзідэнт убачыў, як арганізавана спартыўная работа з моладдзю ў раёне. Аляксандр Лукашэнка наведаў лыжа-роллерную трасу ў аграгарадку Мір. Аб'ект дазваляе праводзіць там спаборніцтвы не толькі раённага, але і абласнога ўзроўню. Кіраўнік дзяржавы ўбачыў, як займаюцца дзеці, які ў іх інвертар і экіпіроўка. Трэнераў самых таленавітых выхаванцаў прапанаваў узнагароджваць матэрыяльна. Агледзеўшы базу, Прэзідэнт даў распараджэнне да мая арганізаваць новае стрэльбішча, а да зімы закупіць тэхніку для падрыхтоўкі трасы. Але найбольш чаканай і матывуючай падзеяй зімы для юных спартсменаў будзе яшчэ адна сустрэча з Аляксандрам Лукашэнкам. Ён пабяцаў узімку правесці трэніроўку на гэтай трасе.

Марыя ДАДАЛКА.
г. Баранавічы

НЕЗАБЫТЫ БОЛЬ

Учора, у 76 гадавіну з дня трагедыі ў беларускай вёсцы Хатынь, гэта сімвалічнае і памятнае для ўсіх нас месца наведаў міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ разам з замежным дыпламатычным корпусам, паведамляе БелТА.

У сваім выступленні кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства заявіў пра тое, што нельга дапусціць скажэнне гісторыі і абяленне злачынцаў Другой сусветнай вайны. «Нельга забываць пра трагічныя старонкі гісторыі, пра подзвіг тых, хто змагаўся супраць фашызму, і нельга дапусціць, каб героямі называлі тых, хто знішчаў людзей», — падкрэсліў міністр.

Немагчыма без болю ўспрымаць трагедыю, што 76 гадоў таму адбылася ў беларускай вёсцы Хатынь, сказаў Уладзімір Макей. Гітлераўскія карнікі жыўцом спалілі і расстралялі 149 чалавек, у ліку якіх было 75 дзяцей. Створаны на месцы трагедыі мемарыяльны комплекс стаў сімвалам ахвяр, пакут і мужнасці беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Хатынь не была адзінай, яе лёс падзялілі сотні іншых беларускіх вёсак. Так, на тэрыторыі Беларусі фашысцкія акупанты ператварылі ў руіны 209 гарадоў і населеных пунктаў, знішчылі 9,2 тысячы вёсак, у тым ліку 628 разам з жыхарамі. З іх 186 вёсак так і не былі адноўлены.

Міністр таксама нагадаў пра шматлікія канцлагеры, у якіх загінула вялікая колькасць людзей. Шмат хто з беларусаў былі сагнаныя ў рабства і ўжо ніколі не вярнуліся на родную зямлю.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што Беларусь за гады сваёй гісторыі шмат разоў была ўцягнутая ў канфлікты і войны, у якіх несла каласальныя страты. «У Беларусі на генным узроўні закладзена непрыманне войнаў і ваенных канфліктаў, — працягнуў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства. — Адсюль і талерантнасць беларусаў, і іх жаданне зрабіць усё для таго, каб мір быў у сваёй краіне, у рэгіёне і ў цэлым у свеце. І гэта імкненне беларусаў да міру і спакою актуальнае сёння як ніколі». Кіраўнік МЗС перасцярог ад таго, каб татальная канфрантацыя, якая адбываецца ў многіх рэгіёнах, не скацілася да трагедыі вайны. «Трэба рабіць усё для падтрымання міру і стабільнасці», — рэзюмаваў Уладзімір Макей.

Фота БелТА.